Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond 9M64B...

Шаноўны Старшыня Вярхоўнага Савета, М.І. Грыб, шаноўныя Дэпутаты!

Усім, хто прагаласаваў супраць рэферэндума на скасаванне беларускай незалежнай дзяржавы (РБ), ліквідацыі і канчатковай русіфікацыі беларускай нацыі, супраць, супраць далейшага вынішчэння нашага беларускага народа цераз ліквідацыю нацыянальных і дзяржаўных сімвалаў - герба „Пагоні" і бела-чырвона-белага сцяга і увядзення другой дзяржаўнай мовы - рускай - <u>Вялікае дзякуй</u>!!! Асабліва Вялікае дзякуй дэпутатам небеларускай нацыянальнасці! Мы беларусы ніколі Вас не забудзем! Вы сапраўдныя інтэрнацыяналісты. Дай Бог, каб у Беларусі Вам жылося добра.

vytoki.net

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond 9М64(3)...

А наконт інтэграцыі з Расіяй не патрэбен ніякі рэферэндум. Ні адзін разумны чалавек у Беларусі не будзе галасаваць супраць такой інтэграцыі. Усябаковая інтэграцыя патрэбна не толькі з Расіяй, але і з усімі, асабліва суседнімі, краінамі, хто на гэта толька згодзен.

Нельга праводзіць рэферэндумы разлічаныя на накулізм, нацыянальны нігілізм, нацыянальную несвядомасць, гістарычную некамнетэнтнасць, вялікі працэнт пасяліўшыхся у Беларусі чужынцаў, каб ліквідаваць нацыянальную беларускую дзяржаву, у якой усе могуць добра жыць.

Не можа Лукашэнка А.Р., стоячы прэзыдэнтам РБ шляхам абяцанак-цацанак, вырашаць са сваімі "чорнымі" палкоўнікамі лёс беларускай нацыі і дзяржавы як ім уздумаецца, а ў дадзеным выпадку на карысць Расеі і ўласную пагібель, каб Беларусь і надалей заставалася бойняй уласнага народа.

Жыве Беларусь!